фы, писатели, литераторы, партийные и т.д.). Периодичность, содержание и качество печатаемых материалов антирелигиозного содержания дают нам четкую картину этапов антирелигиозной политики, проводимой Н.С. Хрущевым.

***Сацукевіч Іван Іванавіч***
*асістэнт кафедры эканамічнай гісторыі*
*Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта (Беларусь)*

## Хрысціянскія назвы вуліц на карце Мінска ў XIX — першай трэці XX стагоддзя

Тапаніміка вуліц і плошчаў беларускіх гарадоў доўгі час заставалася па-за ўвагай даследчыкаў гісторыі. У гэтай рабоце аўтар імкнецца прааналізаваць уплыў канфесійнага жыцця Мінска на назвы вуліц горада ў перыяд панавання Расійскай імперыі і першыя гады існавання савецкай улады.

У першай палове XIX ст. у Мінску захоўваліся назвы вуліц ранейшых часоў. Вулічная сетка цэнтра горада складвалася ў XVI — XVII ст., калі найбольшыя фінансавыя магчымасці для будаўніцтва былі ў каталіцкай канфесіі, што і паўплывала на паходжанне назваў цэнтральных вуліц. Так, вул. Францішканская (зараз Леніна) атрымала імя ад касцёла і манастыра францішканцаў, а Дамініканская (Энгельса) — ад касцёла і манастыра дамініканцаў. Ад праваслаўных храмаў паходзілі назвы вуліц Белацаркоўнай, Казьмадзем'янаўскай, Уваскрасенскай. Вуліца Зборавая (заходняя частка Інтэрнацыянальнай) назву атрымала ад кальвінскага збору — пратэстанцкай царквы, якая існавала тут ў XVI ст. У 1866 г. большасць вуліц гістарычнага цэнтра былі перайменаваныя царскімі ўладамі, што з'яўлялася шэраговай мерай пасля паўстання 1863-1864 гг. у Мінску. Пры гэтым новыя назвы вельмі часта мелі адносіны да Праваслаўнай Царквы. Плошча Высокага рынку (плошча Свабоды) была перайменавана ўладамі ў Саборную плошчу — у гонар праваслаўнага Петра-Паўлаўскага сабора. На мінскай архірэйскай зямлі вырасла прадмесце Архірэйская слабодка з аднаіменнай вуліцай (зараз — Пуліхава), а побач з рачулкай Слепняй мінскі архіепіскап Антоній Зубко стварыў фальварак узорнай гаспадаркі, дарога на які з горада стала вуліцай Антонаўскай. У сярэдзіне XIX ст. новую плошчу на захадзе Мінска назвалі Юбілейнай. Паходжанне назвы тлумачыцца знаходжаннем там помніка — невысокай калоны з крыжом наверсе, які быў усталяваны ў 1826 г., калі мінскія хрысціяне святкавалі 1500-гадовы юбілей Першага Нікейскага сабора. Усе назвы вуліц Мінска з рэлігійным зместам былі перайменаваныя савецкімі ўладамі ў 1919-1934 гг. як "ідэялагічна-варожыя", амаль усе яны зніклі з тапанімічнага ландшафта горада. Сёння ў Мінску ёсць толькі 4 гістарычныя назвы, якія адлюстроўваюць жыццё хрысціянскіх канфесій горада: вуліцы Антонаўская і Кальварыйская, Траецкая набярэжная і Юбілейная плошча.